# У Маладзечне спыніўся «Э$^{р}$»

**Гісторыя і славутасці Маладзечна цікавыя не толькі жыхарам горада. Доказ таму — карціны, літаратурныя творы, даведнікі, буклеты, прысвечаныя Маладзечну, створаныя па ўсёй Беларусі. Не засталася ўбаку ад папулярызацыі ведаў і філатэлія. Так, на адной з марак серыі «Чыгуначныя вакзалы і цягнікі» адлюстраваны мясцовы вакзал і паравоз серыі «Э». Выпушчана марка ў 2006 годзе.**



Паравоз-помнік на вуліцы Лібава-Роменскай увекавечвае подзвіг старэйшага пакалення чыгуначнікаў.

Нагадаем, што паравоз-помнік серыі «Э$^{р}$» устаноўлены ў Маладзечне недалёка ад чыгуначнай станцыі на вуліцы Лібава-Роменскай. Помнік увекавечвае працоўны подзвіг старэйшага пакалення чыгуначнікаў. Выпушчаны паравы лакаматыў у 1948 годзе ў Будапешце (Венгрыя) на дзяржаўным прадпрыемстве «MAVAG».

Мы «пагуглілі» спецыялізаваныя сайты і даведаліся некаторыя цікавыя факты пра легендарную машыну. Так, паравозная серыя «Э» была распрацавана ў 1909 годзе ў былой Расійскай імперыі па заказе прыватнай Уладзікаўказскай чыгункі. Канструкцыя атрымалася надзвычай удалай. Гэта былі адны з найбольш магутных і хуткіх паравозаў таго часу ў свеце. Выпускалася серыя з 1912-га па 1957 год.

Выпуск адбываўся ў былым СССР, а таксама ў Польшчы, Венгрыі, Чэхаславакіі, Румыніі. Паравозы працавалі на самых загружаных і важных напрамках. Даволі простая і надзвычай надзейная тэхніка адыграла важную ролю ў перамозе Савецкага Саюза ў Вялікай Айчыннай вайне.

Трэба адзначыць, што па колькасці лакаматываў серыі (каля 11 тысяч) і па агульнай працягласці выпуску паравоз «Э» з'яўляецца абсалютным рэкардсменам у гісторыі сусветнага паравоза- і лакаматывабудавання.




**Маладзечанскаму чыгуначнаму вакзалу і паравозу серыі «Э» прысвечана паштовая марка.**

Як стала вядома, аналагаў маладзечанскага паравоза замежнай мадыфікацыі «Э$^{р}$» было выпушчана 2938 адзінак. Выпускаліся яны з 1946-га па 1957 год па-за межамі былога СССР.

**Алег БЯГАНСКІ.**
**Фота: Аляксей ПЛАТКО і інтэрнэт-рэсурсы.**